ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 1995
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *ГІСТОРЫЯ*

*Г. У. КАРЗЕНКА*

# АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 40—80-х ГАДАХ

Разглядаючы навуковы патэнцыял як складаную рэсурсную сістэму, неабходна адзначыць, што найбольш дынамічным яе элементам з'яўляліся навуковыя кадры, ад колькасці, структуры і тыпу ўзнаўлення якіх у многіх залежыць развіццё іншых складаючых навуковага патэнцыялу. Гісторыя пасляваеннага развіцця навуковай інтэлігенцыі, колькасныя і якасныя змяненні ў яе саставе да гэтага часу не атрымалі асвятлення ў гістарыяграфіі. Актуальным і нявывучаным аказалася і такое важнае пытанне, як фарміраванне кадраў вышэйшай кваліфікацыі, дзе ў многім непрадуманыя дзяржаўныя падыходы, адсутнасць абгрунтаваных прагнозаў прывялі да «перакосаў», лішку і дэфіцыту дактароў навук пераважна па новых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У аснову артыкула пакладзены новыя дакументальныя і статыстычныя матэрыялы, якія даюць магчымасць інакш паглядзець на працэсы, што адбываліся ў навуцы.

Ваенныя гады і рэпрэсіі істотна адбіліся на кадравым патэнцыяле беларускай навукі. На 1 студзеня 1945 г. налічвалася 583 навуковыя работнікі, з іх 16 дактароў і 54 кандыдаты навук, пры гэтым колькасць дактароў у параўнанні з 1940 г. скарацілася ў тры разы[1]. Навуковыя ўстановы і ВНУ, чыя дзейнасць аднаўлялася на вызваленай ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэрыторыі рэспублікі, мелі вострую патрэбу ў кадрах навуковых работнікаў. Па справаздачах ВНУ, у 1947 г. 131 загадчык кафедраў не меў вучонай ступені. Нават сярод прафесараў, якія ўваходзілі ў састаў кафедраў, 2 з 7 былі без вучоных ступеняў[2]. Асноўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў на аснове разгортвання навуковых даследаванняў павінен быў адыграць адзіны дзяржаўны план павышэння кваліфікацыі кадраў на 1947—1950 гг. Яго распрацоўвалі кафедры, рэктараты, адпаведныя ўпраўленні наркаматаў БССР, АН БССР, Дзяржплан. Ён прадугледжваў абарону 108 доктарскіх і 328 кандыдацкіх дысертацый[3]. Аднак, як паказала жыццё, першая спроба дзяржаўнага планавання на рэспубліканскім узроўні аказалася нерэалізаванай, асабліва ў галіне падрыхтоўкі дактароў навук.

Кадравы дэфіцыт спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі пакрываўся, па-першае, за кошт шырокага прыцягнення дактароў навук з навуковых устаноў Масквы, Ленінграда, іншых рэгіёнаў; па-другое, стымуляваннем самастойнай работы кандыдатаў навук над доктарскімі дысертацыямі; па-трэцяе, шляхам прыкамандзіравання на тэрмін да двух гадоў у дактарантуру АН СССР, якая адкрылася ў 1947 г. У 1949—1952 гг. АН БССР накіравала ў дактарантуру 10 найбольш кваліфікаваных кандыдатаў навук па спецыяльнасцях: арганічная хімія (2), гістарычны матэрыялізм (1), мастацтвазнаўства (1), эканоміка сельскай

[1] Беларускі дзяржаўны архіў (далей — БДА), ф. 30, воп. 5, спр. 164, л. 3—77.
[2] Там жа, спр. 1270, л. 39.
[3] Соколов Н. К. Партийное руководство подготовкой и воспитанием кадров высшей школы БССР. Мн., 1978. С. 39.

гаспадаркі (1), беларуская літаратура (1), архітэктура (1) і інш. [4] Усяго ў 1955 г. ад Беларусі займалася ў акадэмічных інстытутах Масквы 29 дактарантаў [5]. Мінулыя гады выявілі, што планы прыкамандзіравання не выконваліся, а значная частка дактарантаў не прадстаўляла дысертацыі да абароны. Так, з 76 доктарскіх дысертацый, падрыхтаваных у рэспубліцы за 1945—1960 гг., доля абароненых была нязначнай [6].

Пачынаючы з 60-х гадоў у Беларусі праводзілася планавая падрыхтоўка дактароў навук шляхам пераводу кандыдатаў навук, дацэнтаў ВНУ на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў *. Яна арганізавана пры вядучых ВНУ — Беларускім дзяржаўным універсітэце, політэхнічным і тэхналагічным інстытутах, мінскіх педагагічным і медыцынскім інстытутах, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Ужо ў 1962 г. на іх перавялі 15 вучоных (фізіка-матэматычныя навукі — 1, тэхнічныя — 3, біялагічныя — 2, філалагічныя — 4, гістарычныя — 3, эканамічныя — 1, юрыдычныя — 1 чал.) [7]. За дваццаціпяцігадовы (1962—1987) перыяд гэтую магчымасць выкарысталі звыш 250 выкладчыкаў ВНУ.

Сапраўды, Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі ўдалося ў кароткі тэрмін арганізаваць работу. Рабіліся спробы выпрацаваць агульныя прынцыпы кадравай палітыкі, стварыць механізм адбору асоб, якія прэтэндавалі на ступень доктара навук. Складвалася практыка, калі вядучае месца ў падборы кандыдатаў на гэтыя пасады адводзілася кафедры, факультэту. Зразумела, што гэта былі толькі першыя крокі ў вырашэнні вялікай і складанай праблемы. Безумоўна, узнікала многа цяжкасцей, звязаных з матэрыяльным забеспячэннем вучоных, якія завяршалі доктарскія дысертацыі, іх фінансаваннем, публікацыяй матэрыялаў, укараненнем іх у вытворчасць і г. д. Гэтыя цяжкасці адмоўна ўплывалі на падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі: яна ішла марудней, чым меркавалася, яўна адстаючы ад тэмпаў грамадскага развіцця, народнагаспадарчай практыкі, якая адчувала вялікую патрэбу ў дапамозе навукі. Напрыклад, з 62 выкладчыкаў ВНУ, пераведзеных на гэту пасаду з 1962 па 1969 г., 11 чал. (17,7%) абаранілі дысертацыі і 19 чал. (30,6%) прадставілі іх да абароны [8]. Сярод пераведзеных знаходзілася мала вучоных па фізіка-матэматычных, хімічных і іншых дэфіцытных для Беларусі спецыяльнасцях. На наш погляд, сваю негатыўную ролю адыгралі фармальны падыход, адсутнасць аб'ектыўнай ацэнкі пры пераводзе дацэнтаў на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў, вызначэнне тэматыкі дысертацый і этапаў работы над ёю. Вядомы выпадкі пераводу выкладчыкаў, ад якіх па розных прычынах хацелі пазбавіцца. У адпаведнасці з палітычнай кан'юнктурай (у вучоных-гуманітарыяў) часта мяняліся або ўдакладняліся тэмы дысертацый, а задзелы прападалі. Сваю негатыўную ролю, несумненна, адыграла і бескантрольнасць за работай выкладчыкаў ВНУ над доктарскімі даследаваннямі. Усё гэта разам прыводзіла да таго, што праблема кадраў вышэйшай кваліфікацыі заставалася актуальнай на працягу 40—80-х гадоў. У сярэдзіне 80-х гадоў у ВНУ працавалі 99 чалавек, якія поўнасцю скарысталі двухгадовы тэрмін знаходжання на пасадзе, але не абаранілі дысертацыі і не прадставілі

---

[4] Цэнтральны навуковы архіў АН Беларусі (далей — ЦНА АНБ), ф. 1, спр. 207, л. 35; спр. 197, л. 5.

[5] Коммунист Белоруссии. 1955. № 3. С. 34.

[6] Падлік наш: Библиография диссертаций, защищенных в БССР в 1945—1955 и 1956—1965 гг. Мн., 1956; Мн., 1966. З дактарантаў абаранілі дысертацыі ў 1950—1955 гг. М. Г. Ларчанка, І. М. Лушчыцкі, М. А. Жыдовіч, І. М. Сяржанін, Г. Л. Старобінец, Л. І. Фіглоўская і інш. У 1956 г. дактарантура спыніла сваё існаванне як «исчерпавшая свои функции».

* Гл.: Партийно-правительственное постановление «О мерах по улучшению подготовки научных и научно-педагогических кадров» (13 июня 1961 г.) // СПП СССР. 1961. № 10, ст. 79.

[7] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ), ф. 9606, воп. 1, спр. 1002, л. 202.

[8] Там жа, спр. 3848, л. 20 адв.

да абароны. Такіх асоб у БДУ налічвалася 27 чал., БТІ — 19, БДІНГ— 10, МРТІ — 4, Гомельскім універсітэце — 9, па 3 чал. у Беларускім політэхнічным, Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці, Мінскім інстытуце культуры [9]. Слабая ўвага гэтаму пытанню надавалася ў Гродзенскім універсітэце, Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце, Магілёўскім машынабудаўнічым і тэхналагічным інстытутах, у якіх за гады дзесятай пяцігодкі не абаронена ні адна доктарская дысертацыя.

Усё гэта адбівалася на якасным узроўні навукі ВНУ. Так, у галоўнай кузні інжынерных кадраў — ВНУ з 93 кафедраў толькі 29, або 31,3%, узначальваліся дактарамі навук, 8 кафедраў — асобамі без вучонай ступені. Аналагічная сітуацыя была характэрная для большасці ВНУ рэспублікі, дзе да пачатку 80-х гадоў толькі 25% кафедраў узначальваліся дактарамі навук [10].

Такія абыякавыя адносіны да праблемы якаснага росту навуковай інтэлігенцыі праявіліся і пры падрыхтоўцы пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 13 сакавіка 1987 г. «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і выкарыстання навукова-педагагічных і навуковых кадраў». Згодна з апошнім, у сістэме няспыннай адукацыі аднаўлялася дактарантура. У той жа час у дакуменце адсутнічала дакладнасць па праблеме планавання набору ў дактарантуру, матэрыяльнага стымулявання, творчага пошуку, правоў дактарантаў на стажыроўку ў перадавых навуковых школах Захаду, не гаворачы ўжо аб прыярытэтнасці фінансавання падрыхтоўкі дактароў навук па навейшых напрамках НТП. Дактарантура *, якая адкрылася ў 1988—1990 гг. пры ВНУ і навуковых установах Беларусі, пацвердзіла гэтыя палажэнні. Сярод спецыяльнасцей перавbooжалі традыцыйныя для рэгіёна напрамкі (лазерная фізіка, кіраванне ў тэхнічных сістэмах, цеплафізіка, энергетычныя ўстаноўкі, фізіялогія раслін і інш.), дастаткова добра ўкамплектаваныя кадрамі вышэйшай кваліфікацыі, і не вялася іх падрыхтоўка па праблемах экалогіі, радыебіялогіі, інфарматыкі, машынабудавання, сацыялогіі і г. д. [11]

Спробы змяніць негатыўныя тэндэнцыі ў фарміраванні кадравага патэнцыялу беларускай навукі як на дзяржаўным, так і ведамасным узроўні рабіліся ў 70-х гадах. Згодна з пастановай ЦК КПБ і СМ БССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню планавання навукова-даследчых работ і паскарэнню ўкаранення іх вынікаў у вытворчасць» (1976 г.), пачынаючы з 1977 г. былі распрацаваны доўгатэрміновыя мэтавыя комплексныя праграмы, якія ўключалі не толькі правядзенне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ, але і прадугледжвалі падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У аснову былі пакладзены гадавыя і пяцігадовыя планы падрыхтоўкі дактароў навук. Яны былі складзены ў Акадэміі навук, Міністэрстве ВНУ, Міністэрстве аховы здароўя, Міністэрстве асветы і іншых ведамствах рэспублікі. Ставілася задача, каб кафедры ў ВНУ і лабараторыі АН БССР узначальвалі дактары навук. Каардынатарам гэтай работы выступаў Рэспубліканскі міжведамасны савет пры Дзяржплане па пытаннях падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў (1980). Узначаліў яго акадэмік А. С. Махнач.

Ва ўмовах пануючай адміністрацыйнай сістэмы кіравання навукай штогадовыя і пяцігадовыя планы, падрыхтаваныя міністэрствамі і ведамствамі, аказаліся непасільнымі, таму што дамініраваў прынцып «чым больш — тым лепш». Таму аснову іх часта складалі асобы, якія жадалі працаваць над доктарскімі дысертацыямі, перспектывы ж развіцця навукі, паскарэння навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу

[9] Федорович Р. С. Подготовка и переподготовка научно-педагогических кадров. Тбилиси, 1984. С. 25.
[10] Действенный фактор созидания. Мн., 1980. С. 54.
* У 1990 г. у дактарантуры вучыліся 92 чалавекі.
[11] ЦНА АНБ, ф. 1, спр. 80, л. 128.

не заўсёды прымаліся пад увагу. Напрыклад, для інстытутаў біялагічнага, хімічнага і гуманітарнага профілю АН Беларусі заўсёды была характэрна высокая забяспечанасць вопытнымі кадрамі, галоўным чынам па традыцыйных навуковых напрамках. Па новых жа — біятэхналогія, генная інжынерыя — падрыхтоўка неабходных спецыялістаў не вялася, і да сярэдзіны 80-х гадоў у акадэміі была нязначная колькасць супрацоўнікаў вышэйшай кваліфікацыі па гэтых напрамках[12]. З другога боку, у прадстаўляемых у Прэзідыум АН, міністэрства планах абароны доктарскіх дысертацый на працягу шэрага гадоў фігуравалі адны і тыя ж прозвішчы навуковых работнікаў, якім мяняліся толькі тэрміны заканчэння работ. І, як вынік гэтага, у шэрагу акадэмічных інстытутаў не абараняліся доктарскія дысертацыі. За 1971—1975 гг., да прыкладу, не абаронена ні адной доктарскай дысертацыі ў Інстытутах тэхнічнай кібернетыкі, праблем надзейнасці і даўгавечнасці машын, аддзеле фізікі неразбуральнага кантролю[13], у 1976—1980 гг.— у Інстытутах матэматыкі, фізіка-тэхнічным, біяарганічнай хіміі[14], у 1981—1985 гг.— інстытутах фізікі, геахіміі і геафізікі, агульнай і неарганічнай хіміі, торфу, эксперыментальнай батанікі, фізіялогіі, генетыкі і цыталогіі, ядзернай энергетыкі, эканомікі, літаратуры і інш.[15]

Разгляд пытання аб удасканаленні планавых падыходаў у падрыхтоўцы дактароў навук у 1984 г. рэспубліканскім міжведамасным саветам рэальна высветліў стан спраў. З запланаваных 326 дактароў навук фактычна за тры гады XI пяцігодкі было падрыхтавана 151, хоць рост кадравага патэнцыялу і ў першую чаргу дактароў навук з'яўляўся важнейшай умовай навуковай дзейнасці, павышэння яе эфектыўнасці. Якімі ж былі аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны такога становішча? Чаму ж дынаміка росту дактароў навук адставала ад запланаванай патрэбнасці? Каб адказаць на гэта няпростае пытанне, нам давялося не толькі выкарыстаць матэрыялы камісіі, але і па асобных сюжэтах іх пашырыць і экстрапаліраваць па часе. Па нашаму глыбокаму перакананню, асноўную ролю адыгрываў праславуты «сіндром вала», які склаўся ў савецкі перыяд у навуцы, калі распрацоўваліся планы, але за іх ніхто і ніколі не адказваў. Таму зразумела, што ў большасці даследчыкаў адсутнічалі навуковыя задзелы, якія давалі б ім упэўненасць у тым, што яны «выкануюць узятыя абавязацельствы». Існавалі цяжкасці са зборам і абагульненнем эксперыментальнага матэрыялу ў сувязі з недастатковасцю асартыменту ці адсутнасцю прэцызійных вымяральных сродкаў, спектраметрычнага абсталявання, аўтаматызаваных тэхналагічных установак, камп'ютэрнай тэхнікі, без чаго была вельмі ўскладнена і нават немагчыма праверка значнасці новых ідэй і тэарэтычных вынікаў. Не заўсёды з боку кіраўніцтва ВНУ і НДІ таксама назіралася добразычлівасць да асоб, якія працавалі над доктарскімі дысертацыямі (дапамога матэрыяльнымі і фінансавымі рэсурсамі, дапаможным персаналам і г. д.). У ліку іншых — цяжкасці ўкаранення навуковых вынікаў. Як паказаў аналіз, найбольшыя затраты часу (да 8 гадоў) у суіскальнікаў вучонай ступені доктара тэхнічных навук займала ўкараненне НІР. Яно запавольвалася з-за недастатковай сувязі распрацоўшчыкаў з адпаведнымі прадпрыемствамі, незацікаўленасці іх у выкарыстанні новаўвядзенняў, а іншы раз з-за празмернай іх марудлівасці[16].

Звяртае ўвагу і бюракратычны механізм апрабацыі і абароны ў спецыялізаваных саветах доктарскіх даследаванняў. Аб сур'ёзных неда-

---

[12] Коммунист Белоруссии. 1987. № 1. С. 58.

[13] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ), ф. 4, воп. 73, спр. 321, л. 5. У 1975 г. у 16 саюзных інстытутах і 17 інстытутах міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі, дзе працавалі звыш 3 тыс. навуковых супрацоўнікаў, не было ніводнага доктара навук.

[14] ЦНА АНБ, ф. 1, спр. 2214, л. 120—121.

[15] Там жа, спр. 72, л. 97; спр. 73, л. 89.

[16] Бюллетень ВАК СССР. 1990. № 2. С. 17.

працоўках у дадзенай сферы гаварыў на пленуме ВАК міністр М. М. Мяшкоў. На яго думку, абарона дысертацый у іншых буйных навуковых цэнтрах краіны ці на стыку навук або спецыяльнасцей была звязана з пераадоленнем арганізацыйных цяжкасцей. З-за вялікай перагружанасці дысертацыямі суіскальнікаў уласнага рэгіёна спецсаветы гэтых цэнтраў адмаўляліся прымаць да абароны дысертацыі іншагародніх суіскальнікаў або ўстанаўлівалі для абароны гэтых дысертацый вялікі тэрмін — 1—2 гады. У многіх ВНУ і НДІ з мэтай павышэння ролі

Табліца 1. **Змяненне колькасці дактароў навук у Беларусі ў 1961—1988 гг.** *

| Гады | Усяго абаронена доктарскіх дысертацый | У сярэднім за год |
|---|---|---|
| 1961—1970 | 266 | 26 |
| 1971—1975 | 207 | 41 |
| 1976—1980 | 126 | 25 |
| 1981—1985 | 243 | 48 |
| 1986—1988 | 122 | 61 |

* Крыніцы: Статыстычныя зборнікі: Народная гаспадарка БССР за адпаведныя гады.

папярэдняй экспертызы дысертацыйных работ ствараліся адпаведныя камісіі, падкамісіі, саветы і да т. п. У выніку тэрміны праходжання дысертацый значна расцягваліся і нярэдка былі выпадкі, калі з такім парадкам праходжання доктарская дысертацыя рэкамендавалася да абароны праз 2, а то і праз 3 гады [17]. Выкрыўшы мноства недахопаў, камісія прызнала мэтазгодным прадугледжваць пры дзяржаўным планаванні заданні міністэрствам і ведамствам, АН рэспублікі па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі. На жаль, аб вялікай выніковасці дадзенай пастановы гаварыць не прыходзіцца. Як і многія іншыя станоўчыя рашэнні застойных гадоў, яна, не падмацаваная арганізацыйнымі намаганнямі, засталася нявыкананай. Зацверджаны Прэзідыумам АН БССР план абароны доктарскіх дысертацый на 1984—1985 гг. быў выкананы толькі на 56% (намячалася абарона 93 дысертацый, абаронена 54) [18]. У наступныя гады назіралася такое ж [19].

За 60—80-я гады атрад навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі значна папоўніўся. Пры гэтым асноўным каналам яго ўзнаўлення з'яўлялася не арганізаваная форма, а самастойная работа вучоных. Доктарскія дысертацыі рыхтаваліся ў ходзе правядзення даследаванняў, дзе вырашаліся важныя навукова-практычныя праблемы, а самі дысертацыі з'яўляліся навуковай працай, якая адлюстроўвала ўклад самога суіскальніка ў развіццё дадзенай галіны ведаў (табл. 1).

Як бачна, прырост новых інтэлектуальных сіл ішоў адносна стабільна. Становішча часова ўскладнілася пасля рэформы сістэмы атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў у сярэдзіне 70-х гадоў, што было звязана са змяненнем патрабаванняў да работ на суісканне вучонай ступені доктара і кандыдата навук. У наступныя гады колькасць новых зацвярджаемых дактароў навук паступова расла і ў сярэдзіне 80-х гадоў дасягнула ўзроўню, які меўся напярэдадні рэарганізацыі. Нельга

[17] Бюллетень ВАК СССР. 1985. № 3. С. 3.

[18] ЦНА АНБ, ф. 1, спр. 2616, л. 207—208.

[19] На 1986 г. планавалася абарона 43 доктарскіх дысертацый, падрыхтавана 25, у 1987 г.— адпаведна 45 і 24 (ЦНА АНБ, спр. 2844, л. 4; спр. 2890, л. 2). З 1989 г. Прэзідыум АН БССР адмяніў план падрыхтоўкі доктарскіх дысертацый.

Табліца 2. **Размеркаванне колькасці абарон доктарскіх дысертацый па галінах навук (1965—1988)** *

| Галіна навукі | Абсалютны прырост | Галіна навукі | Абсалютны прырост |
|---|---|---|---|
| Фізіка-матэматычныя | 132 | Філалагічныя | 43 |
| Хімічныя | 40 | Геаграфічныя | 5 |
| Біялагічныя | 83 | Юрыдычныя | 17 |
| Геолага-мінералагічныя | 9 | Педагагічныя | 19 |
| Тэхнічныя | 200 | Медыцынскія | 169 |
| Сельскагаспадарчыя | 27 | Фармацэўтычныя | 1 |
| Гістарычныя | 49 | Ветэрынарныя | 7 |
| Эканамічныя | 65 | Архітэктура | 3 |
| Філасофскія | 47 | Псіхалагічныя | 2 |

* Крыніца: Разлік наш паводле даных Упраўлення сацыяльнай статыстыкі Дзяржкамстата Рэспублікі Беларусь.

не адзначыць, па-першае, што дынаміка абароны доктарскіх дысертацый складвалася стыхійна (нягледзячы на спробы каардынавання тэматыкі), але пры гэтым улічвалася натуральнае развіццё навукова-кадравага патэнцыялу рэгіёна. Па-другое, на колькасны рост дактароў у разглядаемыя гады паўплывала і намечаная пэўная «лібералізацыя» ў зацвярджэнні доктарскіх і кантролі над кандыдацкімі дысертацыямі з боку ВАК. Так, калі ў 1980 г. працэнт адхіленых доктарскіх дысертацый складаў 6,6%, то ў 1985 г.— 4,5%, а ў далейшым ён яшчэ больш знізіўся [20].

Агульны стан няпэўнасці ў навукова-тэхнічнай сферы рэспублік былога СССР напярэдадні яе радыкальнага рэфармавання наклаў своеасаблівы адбітак і на характар працэсаў з прысуджэннем вучонай ступені доктара навук. Так, на 1988—1991 гг. прыпаў беспрэцэдэнтны рост колькасці беларускіх вучоных (звыш 100 штогод), абараняўшых доктарскія дысертацыі [21]. Відавочна было фарсіраванае імкненне рэалізоўваць набыты навуковы баланс (не заўсёды дацягваючы да высокага ўзроўню), абараніўшы дысертацыю і атрымаўшы доктарскі дыплом яшчэ агульнасаюзнага ўзору. Найбольшая колькасць абарон прыходзілася ў даследуемы перыяд на долю вышэйшых навучальных устаноў (377) і акадэмічных інстытутаў (473).

Да трох лідзіраваўшых галін па колькасці абароненых дысертацый (табл. 2) на суісканне вучонай ступені доктара навук адносіліся тэхнічныя, медыцынскія і фізіка-матэматычныя навукі. Далей ішлі прадстаўнікі гуманітарных дысцыплін (эканамічныя, гістарычныя, філасофскія, філалагічныя). Дастаткова інтэнсіўна ішоў працэс падрыхтоўкі дактароў навук па біялагічных, хімічных і сельскагаспадарчых навуках. У 1990 г. доля Беларусі ў агульнай колькасці зацверджаных дактароў навук складала: прыродазнаўчых — 2,0%, тэхнічных — 3,3, грамадскіх і гуманітарных — 2,9, медыцынскіх — 2,9, сельскагаспадарчых — 3,3%, што значна апераджала іншыя рэгіёны [22]. У тым жа годзе найбольшы ўклад быў унесены ў падрыхтоўку дактароў навук па ветэрынарыі (каля 12%).

Аднак прырост новых дактароў навук ішоў крайне нераўнамерна. На працягу ўсяго пасляваеннага перыяду Беларусь адчувала дэфіцыт у кадрах вышэйшай кваліфікацыі і адставала ад іншых рэспублік па гэтаму паказчыку. Сур'ёзныя дыспрапорцыі меліся ў камплектаванні

[20] Бюллетень ВАК СССР. 1992. № 2. С. 26—27.

[21] Разлічана па Бюлетэню ВАК СССР за 1988—1990 гг. Толькі ў 1991 г. у рэспубліцы было абаронена 185 доктарскіх дысертацый (Рэспубліка. 1994. 17 лют.).

[22] Бюллетень Высшего аттестационного комитета Российской Федерации. 1992. № 5. С. 20.

навуковых арганізацый па спецыяльнасцях, г. зн. з пункту гледжання непасрэднага ўплыву навукі і вядучых вучоных на развіццё самога навукова-тэхнічнага прагрэсу. Так, з 727 дактароў навук, якія працавалі ў рэспубліцы ў 1979 г., 268, або каля 40%, з'яўляліся спецыялістамі медыка-біялагічнага профілю. Амаль кожны чацвёрты доктар навук працаваў у галіне сацыяльна-эканамічных і гуманітарных навук. У той жа час па шматлікіх спецыяльнасцях тэхнічных навук працавалі толькі 109 чалавек, прычым па такіх вядучых у рэспубліцы галінах народнай гаспадаркі, як электроніка, машынабудаванне, прыборабудаванне, вылічальная тэхніка, архітэктура і многія іншыя, дактары навук налічваліся адзінкамі [23]. У 80-х гадах павелічэнне колькасці спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі адбывалася па традыцыйных для Беларусі напрамках, якія навука дастаткова добра ведала. Адной з прычын гэтага з'яўлялася прыхільнасць навуковых работнікаў да адной і той жа тэматыкі на працягу многіх гадоў і дзесяцігоддзяў (меліся доктарскія дысертацыі, выкананыя, мяркуючы па спасылках на працы аўтара, на працягу 15 гадоў і больш). Адзінкавымі з'яўляліся даследаванні, звязаныя з новай хваляй НТП (аўтаматызацыя і робататэхніка, інфарматыка і мікраэлектроніка, хімічныя і біятэхналагічныя працэсы). Па спецыяльнасцях біялагічных і сельскагаспадарчых навук адсутнічалі работы па экалогіі, а дысертацыі насілі ў асноўным навукова-прыкладны характар. Не было даследаванняў, у якіх вырашаліся б фундаментальныя, агульнабіялагічныя і малекулярна-біялагічныя праблемы.

Каб стаць дактарамі навук, большасці вучоных у 70—80-х гадах спатрэбілася ў сярэднім 13—15 гадоў пасля абароны кандыдацкай дысертацыі. Так, у фізікаў і матэматыкаў часавы інтэрвал складаў 14 гадоў, эканамістаў — 16, гісторыкаў — 11, філолагаў — 15,5, мастацтвазнаўцаў — 19, педагогаў — 15, юрыстаў — 14, біёлагаў — 16, медыкаў — 15, спецыялістаў сельскай гаспадаркі — 16 *. Падобная гадзінная расцягнутасць кваліфікацыйнага росту негатыўна адбівалася на ўзроставым саставе навуковай інтэлігенцыі. Напрыклад, з 20 дактароў навук, якія прадставілі дысертацыі да абароны па гістарычных навуках у 1981—1985 гг., толькі 2 былі ва ўзросце да 40 гадоў, 5 — ад 40 да 50 і 13 — больш за 50 гадоў [24]. Такім чынам, шукаемую вучоную ступень многія вучоныя атрымлівалі ў перадпенсійным, а часта і пенсійным узросце, што адбівалася на іх навуковай выніковасці. Сярод абараніўшых доктарскія дысертацыі да 40 гадоў адзначым акадэмікаў АНБ У. А. Лабунова, Я. Ф. Канаплю, У. П. Платонава, В. Г. Спрынджука, А. В. Сцепаненку, членаў-карэспандэнтаў М. І. Дзямчука, В. Д. Ткачова, У. С. Улашчыка, а таксама У. Е. Барысенку, Б. П. Камракова, У. Л. Чашчына, М. А. Фаміна і інш. Многія ж маладыя вучоныя былі пазбаўлены самастойнасці, ізаляваны ад міжнародных навуковых камунікацый, не атрымлівалі належнай падтрымкі і ацэнкі. У выніку сацыяльны статус вучонага зніжаўся, а рамантыка і прываблівасць навуковай кар'еры губляла сваю дабратворную глебу. У гісторыі беларускай навукі вядомы і такі факт: пры абароне кандыдацкай дысертацыі Б. Б. Бойку і П. І. Альсміку (акадэмікі АНБ) была прысуджана ступень доктара навук.

У многім беды навукі ляжалі ў самой сістэме атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў, якая ў застойныя гады, нягледзячы на прынятую мадэрнізацыю ў 1974 г., адыграла ролю «фільтра». Яна не садзейнічала фарміраванню нестандартных, арыгінальных ідэй, стымуляванню плюралізму думак, здароваму спаборніцтву навуковых школ. Калі патрабавалася дэманстрацыя ідэалагічнага і маральна-палітычнага

[23] НАРБ, ф. 4, воп. 128, спр. 8, л. 108.

* Выбарка зроблена аўтарам па аўтарэфератах дысертацый. Усяго 145 чалавек, якія атрымалі ступень доктара навук у 1976—1985 гг.

[24] Михнюк В. Н., Петриков П. Т. Историческая наука Белорусской ССР. 80-е годы. Мн., 1987. С. 12.

адзінства грамадства, дзейнасць ВАК у рашаючай ступені была зарыентавана на тое, каб не прапусціць работы, якія разыходзіліся з афіцыйна прынятымі канцэпцыямі і ацэнкамі. Нярэдка падаўлялася свабода думкі і іншадумнасці. Дысертант, асабліва які працаваў над гуманітарнымі праблемамі, вымушаны быў прыстасоўвацца да ідэалагічных дакументаў, пастаноў дырэктыўных органаў, думкі асобных «афіцыйных» вучоных. На пярэдні план выходзіла так званая ідэалагічная чысціня, а не строга навуковыя крытэрыі, такія, як карэктнасць пастаноўкі навуковай праблемы (задачы), узровень навуковага аналізу, адэкватнасць і паўната даследчых метадаў, рэпрэзентатыўнасць эмпірычных даных, дакладнае фармуліраванне навуковых вынікаў і практычных рэкамендацый. Менавіта гэтыя і іншыя аналагічныя паказчыкі павінны былі вызначаць навуковую кваліфікацыю аўтара дысертацыі, заахвочваць свабодную навуковую творчасць у самым высокім сэнсе гэтага слова.

Падводзячы вынікі, адзначым, што ў пасляваенны перыяд на дзяржаўным узроўні не ўдалося стварыць у Беларусі мабільную і дынамічную, а галоўнае, эфектыўную сістэму падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. На розных гістарычных этапах гэту ролю павінны былі адыграць дактарантура і перавод выкладчыкаў ВНУ на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў. Але, як паказвае наша даследаванне, асноўная частка прыросту прыпадала не на арганізаваныя формы, а на не плануемую самастойную творчую работу вучонага над доктарскай дысертацыяй. Узнаўленне кадравага патэнцыялу адбывалася не комплексна, у рамках прафесіянальна-галіновай структуры, без уліку змен у народнай гаспадарцы рэспублікі. Скарачэнню прытоку ў навуку моладзі прывяло да пагаршэння ўзроставых параметраў абараняўшых доктарскія дысертацыі. Адзначаныя негатыўныя моманты ў многім тлумачацца някомплексным падыходам да кіравання працэсамі фарміравання і выкарыстання навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі на рэгіянальным узроўні.

*Інстытут гісторыі АН Беларусі*

## Резюме

В статье выделены основные исторические этапы н показан рост колпчества научных кадров высшей квалифнкацнн. Сделан вывод о том, что в Беларуси не удалось в послевоенный период создать целенаправленный н действенный механизм подготовки докторов наук, увязать его с потребностямн народного хозяйства и науки.

## Summary

There are distinguished the main historical stages and is shown the growth of the scientific personnel number in the article. The conciusion is drawn that it was impossible to create a functioning and purposeful mechanism for training doctors of science and to associate it with demands of the national economy and science in the post-war period in Belarus.

*Я. К. АНІШЧАНКА*

# ФІНАНСАВАЯ РЭВІЗІЯ КАГАЛАЎ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ПАЧАТКУ XIX ст. І ЯЕ ВЫНІКІ

Са шматлікай літаратуры, прыводзіць якую няма неабходнасці, вядома, што з 1802 г. царскі ўрад заняўся распрацоўкай шырокай рэформы жыцця яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыях, далучаных да імперыі ў 1772, 1793 і 1795 гг. Затым пачалося масавае высяленне яўрэяў з вёсак у гарады. У абодвух выпадках тым акцыям спадарожнічала справа аб ліквідацыі даўгоў яўрэйскіх абшчын (кагалаў).

У сціплым выглядзе прадгісторыя цэнтралізавана-дзяржаўнага рэгулявання тых даўгоў выглядае так. Яшчэ ў 1764 г. пры кожным земскім